IH PAN
POLSKA AKADEMIA NAUK
INSTYTUT HISTORII
im. Tadeusza Manteuffla

Rynek Starego Miasta 29/31 • 00–272 Warszawa
tel.: centrala (22) 831 02 61 • 831 02 62
sekretariat (22) 831 36 42 • fax: (22) 831 36 42
e-mail: ihpan@ihpan.edu.pl • www.ihpan.edu.pl

S-082-1/20 Варшава, 13 кастрычніка 2020 г.

Лакиза Вадим Леонидович,
Заместитель директора по научной работе
Институт истории Национальной академии наук Беларуси
ул. Академическая, 1, 220072,
г. Минск, Республика Беларусь

Паважаны спадар прафесар,

Мы, рэдактары гістарычных часопісаў, выдаваных Інстытутам гісторыі ім. Тадэвуша Мантэйфэля Польскай акадэміі навук, выказваем глыбокую нязгоду з рэпрэсіямі супраць беларускіх гісторыкаў, якія адбыліся ў апошнія тыдні. Гэтыя рэпрэсіі носяць розны характар: збіццё, затрыманні, грашовыя пакаранні, пазбаўленне волі, пагрозы звальнення з працы, а нават звальненні. Яны закранулі, між іншым, Вадзіма Белаўца, Валерыя Кобрынца, Андрэя Мацука, Андрэя Радамана, Алеся Смалянчука, Наталлю Сліж і Міколу Воўкава. Усе гэтыя гісторыкі вядомыя не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, яны гадамі супрацоўнічалі з чэшскімі, літоўскімі, нямецкімі, украінскімі і польскімі гістарычнымі навуковымі ўстановамі і гісторыкамі. Яны актыўна ўдзельнічаюць у навуковым жыцці гэтых краін, праводзячы сумесныя даследчыя праекты, выступаючы з дакладамі на канферэнцыях і прыймаючы ўдзел у міжнародным абмене навукоўцамі. Дзякуючы вялікім навуковым дасягненням, яны прасоўваюць беларускую гістарычную навуку ў Еўропе. Такім чынам, рэпрэсіі, накіраваныя супраць іх, шкодзяць не толькі беларускай навуцы і яе выбітным прадстаўнікам, але таксама *абвастраюць* сацыяльную напружанасць ды пагаршаюць міжнароднае становішча краіны. Адхіленне гэтых даследчыкаў ад навуковай дзейнасці будзе незваротнай стратай для беларускай гістарыяграфіі і беларускіх навукова-даследчых інстытутаў. Таму мы заклікаем дзяржаўныя і навуковыя органы Рэспублікі Беларусь спыніць рэпрэсіі супраць навукоўцаў, у тым ліку супраць нашых Калежанак і Калег-гісторыкаў.

Доктар габілітаваны, прафесар ІГ ПАН Даніэль Бацькоўскі,
галоўны рэдактар „Studia z Dziejów Rosji i Europy Środkowo-Wschodniej”

Прафесар, доктар габілітаваны Дарыюш Яраш,
галоўны рэдактар „Rocznik Dziejów Społecznych i Gospodarczych”

Прафесар, доктар габілітаваны Томаш Юрэк,
рэдактар „Roczniki Historyczne”

Прафесар, доктар габілітаваны Войцех Крыгсайзэн,
галоўны рэдактар „Odrodzenie i Reformacja w Polsce”

Доктар габілітаваны, прафесар ІГ ПАН Ёанна Налівайка-Кулікаў,
галоўны рэдактар „Acta Poloniae Historica”

Прафесар, доктар габілітаваны Анджэй Новак,
рэдактар „Kwartalnik Historyczny”

Прафесар, доктар габілітаваны Анджэй Рахуба,
галоўны рэдактар „Studia Źródłoznawcze. Commentationes”

Доктар габілітаваны Пётр Вэнцоўскі,
галоўны рэдактар „Studia Źródłoznawcze. Commentationes”

Прафесар, доктар габілітаваны Тадэвуш Вольша,
галоўны рэдактар „Dzieje Najnowsze”

Прафесар, доктар габілітаваны Анджэй Закшэўскі,
галоўны рэдактар „Rocznik Lituanistyczny”